**Сутула, Г.** Патрыятычнае выхаванне. Ваеннымі дарогамі Афганістана / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2023. — 22 лют. — С. 4.

## ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ. ВАЕННЫМІ ДАРОГАМІ АФГАНІСТАНА



**Прайшоў былы ўчастковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Глыбоцкага РАУС, маёр міліцыі ў адстаўцы Валянцін Масальскі** *(на здымку)*. **Аб нялёгкіх ваенных буднях, трывожнай службе і выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ён расказаў падчас сустрэчы з калектывам раённага аддзела міліцыі.**

Валянцін Рыгоравіч пачынаў працоўны шлях рабочым Мінскага трактарнага завода. Пасля заканчэння Магілёўскага педінстытута імя А. Куляшова прыйшоў служыць у міліцыю.

Дваццаць гадоў адпрацаваўу інспекцыі па справах непаўналетніх, займаўся выхаваннем падлеткаў з нядобранадзейных сем'яў, стараўся, каб яны выраслі працавітымі і добрасумленнымі людзьмі, сталі прыстойнымі грамадзянамі сваёй краіны. Узнагароджаны медалямі «70 гадоў Узброеных сіл СССР» і «У памяць 10-годдзя вываду войск з Афганістана».

– Сёння ў райаддзеле міліцыі няма ніводнага дзеючага супрацоўніка з ліку воінаў-інтэрнацыяналістаў, а таму аповеды сведак і ўдзельнікаў тых трагічных падзей – найлепшы прыклад патрыятычнага выхавання, якому мы ўдзяляем асаблівую ўвагу. Такія сустрэчы ўмацоўваюць повязь пакаленняў і ўсталяваныя гадамі традыцыі ўшанавання ветэранаў баявых дзеянняў і працы, з'яўляюцца доказам таго, што служба ў мірны час не ідзе ні ў якое параўнанне з той, якую неслі нашы землякі-калегі ў Афганістане. І, вядома ж, ваенныя расказы – гэта перасцярога на будучае, заклік да сучаснікаў цаніць і берагчы мір на зямлі, – сказаў намеснік начальніка Глыбоцкага РАУС па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні падпалкоўнік Юрый Баран.

**Галіна СУТУЛА**